# БУДАТРАДЫ БУДУЮЦЬ НОВАЕ ГРАМАДСТВА

Студэнты — народ актыўны. Адпачываць, лежачы на канапе, — не для іх. Студэнты БДУ — не выключэнне: кожны год тысячы юнакоў і дзяўчат удзельнічаюць у праграме студэнцкага гарадка «Працоўнае лета». Гэта ідэальны варыянт для тых, хто хоча і папрацаваць, і адпачыць.

## «Будуем свой дом сваімі рукамі»

Пад такім дэвізам дзейнічаюць студэнцкія рабочыя атрады БДУ па добраўпарадкаванню і падрыхтоўцы да новага навучальнага года універсітэцкіх інтэрнатаў. Фарміраваннем атрадаў штогод займаецца студгарадок БДУ.

Гэтым летам іншагароднія студэнты, якія пражываюць у інтэрнатах БДУ і не лянуюцца сваімі рукамі ўладкоўваць сваё жыллё, утварылі студэнцкія рабочыя атрады ў складзе 100 чалавек у ліпені і 101 чалавека ў жніўні. Брыгады працавалі ва ўсіх 10 інтэрнатах БДУ: фарбавалі вокны, дзверы, рамантавалі мэблю, абклейвалі шпалерамі сцены. Не засталіся без увагі і прылягаючыя тэрыторыі.

## Ад дома — да дзяржавы

Для працалюбівых студэнтаў былі прадугледжаны і больш маштабныя праекты, карысць якіх распаўсюджваецца на ўсю дзяржаву: рэканструкцыя Аўгустоўскага канала (у складзе зводнага атрада Мінскага гарадскога камітэта БРСМ), будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Мінулым летам студэнты БДУ працавалі і ў краязнаўчым атрадзе (ён займаўся правядзеннем археалагічных раскопак у зоне рэканструкцыі Аўгустоўскага канала), у педагагічных атрадах у спартыўна-аздараўленчым комплексе «Брыганціна», у валанцёрскім атрадзе грамадскай прыёмнай камісіі (дапамагалі абітурыентам запаўняць анкеты і заявы), атрадзе па аказанню адраснай дапамогі ветэранам. У сувязі з нядаўнім адкрыццём новага навучальнага корпуса юрыдычнага факультэта для студэнтаў з'явілася работа па перавозцы кніг, мэблі, матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання кафедраў і аўдыторый.

Добра папрацаваўшы летам, юнакі і дзяўчаты заслужылі, каб іх стараннасць была заўважана і адзначана. Спецыяльна для іх сёння а 18 гадзіне ў кінатэатры «Цэнтральны» адбудзецца ўрачыстае падвядзенне вынікаў дзейнасці студэнцкіх атрадаў. Лепшыя будатрадаўцы атрымаюць каштоўныя падарункі, граматы і ўдзячнасці. Віншаваць іх будуць прадстаўнікі трох устаноў: родная alma mater, БРСМ і Мінгарвыканкама. Пасля цырымоніі ўзнагароджання запланавана канцэртная праграма, падрыхтаваная творчым актывам студэнцкага гарадка БДУ, і новая маладзёжная камедыя «Марыць не шкодна!» — падарунак ад кінатэатра «Цэнтральны». БДУ супрацоўнічае з кінатэатрам ужо даўно: газета «Студгарадок» пастаянна дае анонсы рэпертуару кінатэатра, праводзіць конкурсы на прызы кінатэатра (а менавіта білеты на самыя цікавыя фільмы), у Памяшканні кінатэатра «Цэнтральны» БДУ праводзіць акцыі, сустрэчы.

На ўрачыстае мерапрыемства запрошаны рэктар БДУ Васіль Стражаў, сакратар Цэнтральнага Камітэта БРСМ Яўген Карпік, першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Сяргей Чыгрэй, дырэктар мінскага гарадскога Цэнтра занятасці насельніцтва Чэслаў Роўба...

Паводле слоў сакратара Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Вольгі Цішуравай, у маладзёжных будатрадах за лета працавалі 1819 чалавек. Акрамя таго Мінскі камітэт БРСМ накіраваў 653 чалавекі на працу ў сельскагаспадарчых атрадах, 1291 чалавека — у валанцёрскія лагеры, індывідуальна працаўладкаваў 3499 маладых людзей. І гэта даныя толькі па Мінску; уявіце, якія маштабы дасягае праект па ўсёй рэспубліцы.

У бліжэйшым будучым БРСМ плануе правесці штогадовы гарадскі конкурс на лепшы будатрад. Не апошнюю ролю тут адыграюць справаздачы, якія прадстаўляюць усе будатрады (справаздачу рыхтуе камандзір-камісар, якога выбіраюць самі студэнты): у якіх мерапрыемствах удзельнічалі, як арганізоўвалі вольны час.

На двух самых цікавых праектах для студэнтаў мы засяродзілі сваю ўвагу: будоўля Нацыянальнай бібліятэкі і рэканструкцыя Аўгустоўскага канала.

## Цаглінкі — у Нацыянальную бібліятэку...

Заробтныя платы студэнтаў, якія ўдзельнічалі ў працэсе будаўніцтва Нацыянальнай бібліятэкі, вагаліся ў залежнасці ад відаў работ: прыбіранне тэрыторыі, апрацоўка работы ў памяшканнях, праца ў якасці падсобных рабочых.

Расказвае Юрый Міронаў, студэнт 3 курса факультэта журналістыкі БДУ:

— Універсітэт накіраваў у будтрэст, там прыпісалі да прараба, які знаходзіў для кожнага з нас занятак. Працавалі мы ў якасці падсобных рабочых без аніякіх патуранняў на маладосць і зялёнасць. Грузілі ўсё, што прывозілі: ці то граніт, ці то жалеза або цэмент. Працоўны дзень доўжыўся з 8 да 17 гадзін (з перапынкам на абед), 2 разы трэба было адзначацца. Заробак склаў прыкладна 340 тысяч рублёў. Наш будатрад налічваў каля двух дзесяткаў студэнтаў. Акрамя нас быў яшчэ асобны атрад студэнтаў БНТУ (у іх гэта праходзіла ў рамках вытворчай практыкі). На будоўлі былі і падлеткі, якіх сюды накіраваў цэнтр занятасці.

## ...і камяні — ў Аўгустоўскі канал

Гэты аб'ект стане свайго роду шлюзам, які пры адкрыцці пусціць паток замежных турыстаў Беларусь, што пакладзе пачатак развіццю міжнароднага турызму ў нашай краіне.

На Аўгустоўскім канале папрацавалі за лета 2 будатрады ад Мінска (35 чалавек у ліпені і 30 чалавек у жніўні, частка тых, хто працаваў у першую змену, засталася і на другую). Яны ачышчалі канал ад смецця, умацоўвалі берагі, добраўпарадкоўвалі тэрыторыю. Жылі студэнты ў бараках, у былой ваеннай часці. Працоўны дзень доўжыўся з 8 да 19 гадзін (з перапынкам на абед), кармілі ў сталовай. Сярэдні іх заробак склаў 350—400 тысяч рублёў.

— Студэнты якіх ВНУ працавалі на Аўгустоўскім канале? — цікаўлюся ў сакратара Мінскага гарадскога камітэта БРСМ Вольгі Цішуравай.

— БДУ, БДУІР (гэты універсітэт вызначыўся самай вялікай колькасцю студэнтаў, яны лепш за ўсё і папрацавалі), БНТУ, БДУ-ІФК, Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Сахарава і інш.

— А дзяўчат у будатрадах многа было?

— На 2-й змене крыху болып: 8.

Нас больш за ўсё цікавіў удзел студэнтаў БДУ ў першай маладзёжнай будоўлі краіны (такі статус прысвоены рэканструкцыі Аўгустоўскага канала паводле ўказа прэзідэнта). На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказваў Аляксандр Лянкевіч, загадчык штаба працоўных спраў пры ўпраўленні выхаваўчай работы з моладдзю БДУ, сакратар БРСМ БДУ.

**— Колькі студэнтаў БДУ папрацавала ў складзе будатрадаў на аднаўленні Аўгустоўскага канала?**

— Пяць чалавек — у ліпені і столькі ж — у жніўні. Гэта студэнты Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, а таксама гістарычнага, фізічнага і іншых факультэтаў.

**— Ці многа было жадаючых, Аляксандр?**

— Студэнтаў, жадаючых папрацаваць летам на Аўгустоўскім канале, сапраўды, было многа. Схема іх прыняцця такая: яны прыходзілі з заяўкамі, са студэнтамі размаўлялі (бо для нас галоўны крытэрый маральнага плану: важна, каб чалавек быў добры, надзейны), давалі ім накіраванне на медыцынскі агляд і форму, неабходную для запаўнення, у якой самым важным было пагадненне з дэканатам. Тыя, хто паспеў прайсці медагляд ва ўстаноўлены тэрмін і хто атрымаў згоду ад дэканата, паехалі працаваць у будатрадзе.

**— На ўрачыстай цырымоніі лепшым будатрадаўцам будуць уручаны падарункі: якім чынам выберуць лепшых і што падораць?**

— Лепшымі будатрадаўцамі прызнаны тыя, хто найбольш адказна падышоў да справы, праявіў сапраўдную актыўнасць і ўмудрыўся пры гэтым не зарабіць ніякіх заўваг. Граматы і ўдзячнасці будуць уручаны ў розных «намінацыях»: тым, хто працаваў на Аўгустоўскім канале, на будоўлі Нацыянальнай бібліятэкі, у складзе краязнаўчага атрада, валанцёрскіх атрадаў дапамогі, хто займаўся добраўпарадкаваннем інтэрнатаў і інш. Свае падарункі прыйдуць уручаць прадстаўнікі студгарадка БДУ, БРСМ і Мінгарвыканкама.

**— Аляксандр, як вы самі ставіцеся да ідэі далучаць студэнтаў да будоўлі?**

— Гэта выдатная ідэя, бо студэнты праводзяць час з карысцю і для душы. Знаходзячыся далёка ад дома, яны знаёмяцца, ладзяць адно з адным, працуюць і весяляцца. Члены кожнага атрада перад ад'ездам склалі план мерапрыемстваў і ўзгаднілі яго з камітэтам БРСМ. Былі прадугледжаны экскурсіі, разнастайныя конкурсы: на лепшага байца, містэра і міс атрада, самую цікавую сценгазету.

Прасочым, як рэалізуецца адзін з прынцыпаў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі «далучэнне маладых грамадзян да практычнага вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем грамадства» на справе. Расказвае Сяргей Гаўрыцкі, студэнт 3 курса факультэта журналістыкі БДУ:

— Працаваў я на рэканструкцыі Аўгустоўскага канала ажно 2 месяцы (ліпень і жнівень). Рэканструкцыя прадугледжвала ўмацаванне берагоў і адначасова іх аднаўленне. Кладка ахоўвае берагі ад асыпання і ў той жа час з'яўляецца імітацыяй пад даўніну. Чым займаўся я? Плотна ўкладваў буйное каменне і ўбіваў яго кувалдай у бераг.

Заробак Сяргея склаў прыблізна мільён рублёў.

**— На што грошы патраціў? — пытаюся.**

— Камп'ютар купіў *(задаволена ўсміхаецца)*.

Студэнты працавалі на рэканструкцыі нароўні з рабочымі.

Агульнае ўражанне ў Сяргея — прыемнае:

— *Я* знайшоў там шмат новых сяброў і... сустрэў сваё сапраўднае каханне *(усміхаецца)*.

— Няўжо і дзяўчаты працавалі на Аўгустоўскім канале? — здзіўляюся я.

— Так, але работа ў іх была крыху іншая: пад буйное каменне, якое ўкладалі хлопцы, яны падсыпалі дробнае. Плацілі ім, дарэчы, столькі ж.

Будатрадаўцаў запрасілі на рэканструкцыю канала Агінскага наступным летам. І ў наступным годзе новая «маладая рунь» будзе дапамагаць аднаўляць дзяржаву, а значыць, і яе грамадства. Вялікае, як вядома, пачынаецца з малога: аднаўленне дзяржавы — з працы будатрада.

**Ала МАЧАЛАВА.**

